Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 18 (709) ● Пятніца 17 мая 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● Да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі ● Нашы юбіляры ● На парадку дня вытворчая практыка ● Спартыўныя паядынкі ● Гісторыя сведчыць

## У ГОНАР ВЯЛІКАЙ ДАТЫ

Урачыста адзначыў калектыў універсітэта 150-годдзе з дня нараджэння генія чалавецтва Карла Маркса. На канферэнцыю, прысвечаную гэтай вялікай даце, сабраліся выкладчыкі, аспіранты, студэнты. З уступным словам выступіў рэктар універсітэта, акадэмік, прафесар А. Н. Сеўчанка.

З вялікай цікавасцю былі сустрэты даклады прафесараў У. М. Сікорскага, В. І. Сцяпанава, І. М. Лушчыцкага, доктара філасофскіх навук Р. А. Левіна, дацэнтаў М. Р. Круцько, А. М. Паўлючэнкі, С. Я. Янчанкі.

* * *

На факультэтах і кафедрах прайшлі семінары і гутаркі аб заснавальніку навуковага камунізма К. Марксу.

На кафедры, якую ўзначальвае І. А. Мазжухін, адбылося тэарэтычнае субяседаванне, у якім прынялі актыўны ўдзел камуністы тт. Трэбко, Штыцко, Васкрэсенскі, Каралёў.

Асаблівую цікавасць выклікала выступленне Т. А. Трэбко аб уплыве вучэння К. Маркса на развіццё рэвалюцыйнага руху ў Расіі.

* * *

Мнагалюдна было ў аўдыторыі 482 фізічнага корпуса універсітэта. Тут сабраліся на навукова-тэарэтычную канферэнцыю больш 200 замежных студэнтаў і аспірантаў, што навучаюцца на падрыхтоўчым і асноўных факультэтах універсітэта.

Канферэнцыю, прысвечаную 150-годдзю з дня нараджэння К. Маркса, адкрыў дэкан па навучанню замежных студэнтаў, стажораў і аспірантаў дацэнт К. К. Герман.

З дакладам «Маркс і сусветны рэвалюцыйны працэс» выступіў старшы выкладчык кафедры навуковага камунізма Г. Я. Галенчанка.

Прачыталі свае даклады і замежныя студэнты. Даклад на тэму: «Марксізм і рэвалюцыйны рух у В'етнаме» прачытаў студэнт пятага курса фізфака Нгуен Ван Фунг. Тэма даклада студэнта гэтага ж факультэта Нгуен Хок Тхі — «Вялікая рэвалюцыя ў галіне тэхнікі, культуры, ідэалогіі ў святле вучэння марксізма».

С. БАРКОЎ.

# Да экзаменацыйнай сесіі засталося два тыдні. Кожны дзень — падрыхтоўцы!



## ПЕРАД ВЫПУСКНОЙ...

Блізіцца экзаменацыйная сесія. Для 129 в'етнамскіх студэнтаў, што навучаюцца на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта, яна будзе выпускной.

Ужо зацверджан склад экзаменацыйнай камісіі, якую ўзначаліў дэкан факультэта кандыдат эканамічных навук Міхаіл Кірылавіч Гарбачоў. У склад камісіі, акрамя выкладчыкаў падрыхтоўчага факультэта, увайшлі старшы выкладчык кафедры цвёрдага рэчыва кандыдат фізіка-матэматычных навук В. І. Пракошын, старшы выкладчык кафедры агульнай хіміі кандыдат хімічных навук М. А. Паўловіч, асістэнт кафедры алгебры А. Э. Жыгота. Яны дапамогуць больш дыферэнцыравана і мэтанакіравана падысці да ацэнкі ведаў студэнтаў, тым больш, што па выніках гэтай экзаменацыйнай сесіі в'етнамскія таварышы ў залежнасці ад узроўню падрыхтоўкі будуць накіроўвацца для прадаўжэння вучобы па выбранай спецыяльнасці ў вну ці тэхнікумы розных гарадоў Савецкага Саюза.

Цяперашняя экзаменацыйная сесія будзе больш складанай, чым зімовая. Калі зімой здавалі экзамен толькі па рускай мове, а па ўсіх астатніх — залікі, то зараз прыдзецца здаць залік па курсу «Савецкі Саюз», а затым экзамены па рускай мове, фізіцы, хіміі і матэматыцы. Прытым, па матэматыцы давядзецца здаваць два экзамены—пісьмова і вусна.

У апошнія дні перад сесіяй ідзе напружаная падрыхтоўка. Выкладчыкі падрыхтоўчага факультэта праводзяць дадатковыя заняткі, кансультацыі па ўсіх дысцыплінах. Сярод в'етнамскіх студэнтаў арганізавана ўзаемадапамога. Варта адзначыць вялікую работу над сабой і ў дапамозе сваім таварышам па вучобе такіх студэнтаў, як Нгуен Дык Х'ен, Ву Туан Ань, Хаанг Тхо Тхай, Чан Тхі Тху Х'ен, Фунг Ван Зунг, Нгуен Тхі В'ет Хыонг і многіх іншых. Зімовую сесію яны вытрымалі на выдатна і зараз мяркуюць не здаваць свае пазіцыі. Самі павінны выйсці пераможцамі і таварышам сваім дапамагчы пераступіць парог у вялікую навуку.

Хочацца пажадаць в'етнамскім сябрам паспяховага заканчэння нашага падрыхтоўчага факультэта.

Традыцыйнага вам «ні пуха, ні пяра» на экзаменах!

Р. ЛУЧАНОК,
інспектар па вучэбнай рабоце падрыхтоўчага факультэта.

На здымку: выкладчык хіміі Т. А. Малама дае кансультацыю.

Фота Я. Данілава.

## МАТЭМАТЫКА І ЮРЫСТЫ

Матэматычная падрыхтоўка студэнтаў на першых курсах прыродазнаўчых факультэтаў і аддзялення палітэканоміі юрфака ў асноўным прысвечана метадам рашэння ўжо сфармуляваных задач, якія маюць важнае значэнне ў засваенні базавых дысцыплін.

Калі беражна адносіцца да часу, то адведзенай колькасці гадзін будзе дастаткова для засваення курса. Аднак бяда ў тым, што выкладчыкам матэматычных дысцыплін, як правіла, даводзіцца ў першым паўгоддзі першага курса тлумачыць школьную матэматыку, таму што многія ўчарашнія школьнікі недастаткова падрыхтаваны і не ўспрымаюць адразу прапанаваны курс. Выкладанне матэматыкі ў сярэдняй школе вядзецца хаатычна; у адных школах выкладаюць яе поўнасцю, у другіх сяк-так: не праходзяць біном Н'ютана, адваротныя кругавыя функцыі і г. д. На жаль, ёсць студэнты, якія не могуць пазбавіцца ад трохпавярховага дробу.

Натуральна, добрасумленнаму студэнту даводзіцца напружана працаваць: наганяць упушчанае ў школе і яшчэ засвойваць новую інфармацыю па чытаемых курсах. У такім становішчы апынуліся студэнты першага і другога курсаў аддзялення палітэканоміі юрыдычнага факультэта. Група студэнтаў аддзялення палітэканоміі, з якой я працую, хоць і неаднародная па ўзросту і падрыхтоўцы, але даволі актыўная. Усе студэнты добрасумленна рыхтуюцца да заняткаў па матэматычнаму аналізу і тэорыі магчымасцей, ахвотна адказваюць каля дошкі.

У групе многа былых воінаў, якія вярнуліся са службы ў Савецкай Арміі і Флоце, яны ж і задаюць рабочы настрой. Добра працуюць над сабой і вучацца такія студэнты, як В. Шыхатава, Н. Абрамава, Л. Давыдзенка, І. Клімаў, Л. Кірсанава, А. Вараб'ёў, І. Рабіновіч і многія іншыя. Гэта выдатнікі вучобы і грамадскай работы на курсе. Староста групы Л. Давыдзенка, былы марак, сам многа працуе і не дае спакою тым, для якіх хадзячыя меркаванні служаць замест ведаў, а добра падвешаны язык выдатна замяняе думкі.

Выкладчыкі, вядома, імкнуцца дапамагчы студэнтам засвоіць асновы матэматычных ведаў і прымяняць іх на практыцы, выкарыстоўваюць кожную магчымасць, каб растлумачыць складаныя раздзелы.

Думку аб тым, што на лекцыях могуць выкладацца толькі некаторыя пытанні курса, як тлумачэнні да прадмета, я лічу няправільнай. Яна адкрывае праход да скарочанага чытання курса, што ніяк не садзейнічае дружбе студэнтаў з матэматыкай.

У другім паўгоддзі працаваць уже лягчэй, хоць бы таму, што школьныя прабелы засталіся ззаду. Наш абавязак цяпер дапамагаць студэнтам лепш засвоіць праграмныя курсы і падбадзёрыць іх перад вясеннімі экзаменамі.

А. МАКСІМЕНКАЎ,
старшы выкладчык матфака.

У ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

## НА ГАЛОЎНЫХ НАПРАМКАХ

На чарговым пасяджэнні Вучонага Савета, які адбыўся на гэтым тыдні, абмеркаваны становішча вытворчай і вучэбнай практыкі і праграміраванага навучання.

Прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў у змястоўным дакладзе прааналізаваў ход вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтаў усіх факультэтаў. У 1966-67 навучальным годзе 2628 студэнтаў прайшлі вучэбную і 1018 вытворчую практыку. Добра прынялі практыкантаў кіраўнікі многіх устаноў, што з'яўляюцца базамі для праходжання практыкі студэнтаў універсітэта, у прыватнасці, навукова-даследчых інстытутаў АН БССР і прадпрыемстваў, куды накіроўваліся выпускнікі.

Паспяхова прайшла вучэбная практыка ў студэнтаў малодшых курсаў па спецыяльнасцях: геалогія, геаграфія, руская мова і літаратура, матэматыка, журналістыка, правазнаўства, радыёфізіка і фізіка.

Разам з гэтым, адзначыў А. Я. Малышаў, ёсць і шэраг істотных недахопаў. Не адпавядае запатрабаванням вучэбна-метадычнае кіраўніцтва вытворчай падрыхтоўкай з боку некаторых кафедр. Недастаткова ўдзельнічаюць у правядзенні практыкі прафесары і дацэнты спецыяльных кафедр, неахайна вядзецца дакументацыя практык, за выключэннем юрыдычнага факультэта, дзе практыканты абавязковым чынам вядуць дзённікі, а па заканчэнні практыкі прад'яўляюць характарыстыкі і справаздачы.

На хімічным і фізічным факультэтах, філалагічным (першы курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры), першым-другім курсах факультэта журналістыкі і былі парушаны планы правядзення вучэбнай практыкі.

У прынятым Саветам рашэнні вызначаны меры па паляпшэнню практычнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» прапанавана сістэматычна і глыбока асвятляць станоўчы вопыт правядзення вытворчай практыкі.

Аб становішчы праграміраванага навучання дакладваў Савету загадчык кафедры электронных матэматычных машын М. М. Пасноў. Ён расказаў аб тэхнічным забяспечэнні і энтузіястах праграміраванага навучання, падкрэсліў неабходнасць больш шырокага ўкаранення машыннай тэхнікі ў навучальны працэс.

## ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

*У студэнцкай сям'і шмат юнакоў і дзяўчат, якія на працягу вучобы адзначаюцца не толькі глыбокім вывучэннем абранай спецыяльнасці, але і вялікай грамадскай працай. Імёны многіх з іх занесены на Дошку Гонару універсітэта.*

*Сёння мы знаёмім чытачоў з трыма такімі студэнтамі.*

*Злева направа: Н. Беляковіч (гістфак), В. Трэццякоў (юрфак), У. Шаціхін (фізфак).*

*Фота Г. МАРОЗАВА.*





# Па ленінскаму шляху




БССР
і
КПБ

Гэтыя словы з пісьма студэнта пятага курса фізфака Лам Нгок (ДРВ). А вось яшчэ цікавае пісьмо ад нашага выпускніка, былога студэнта фізічнага факультэта Нгуен Куанг Мінь:

«...Прайшло больш пяці месяцаў з той пары, калі мы развіталіся з вамі... У Ханой мы прыехалі з радасным хваляваннем. Як даўно я не бачыў яго! Цяпер ён выглядае ваенным, але ў той жа час на дзіва спакойным, якім я бачыў яго пяць гадоў таму назад у мірныя дні... Мае бацькі, вядома, былі вельмі рады майму звароту. Яны часта пыталі мяне пра вучобу, жыццё ў Савецкім Саюзе. І выказваюць удзячнасць усім, хто дапамагаў мне ў гэтыя гады... Мы працавалі ў Ханоі, але амерыканцы скінулі на наш інстытут больш тысячы шарыкавых бомб... Пасля гэтага мы эвакуіраваліся ў вёску... Цяпер жывём у цяжкіх умовах, але працуем з энтузіязмам і ўпарта імкнемся да вышынь навукі...

Часта ўспамінаю сваіх савецкіх сяброў і заўсёды памятаю вялікую дапамогу, якую вы мне аказвалі...»

Цяпер у нашым універсітэце навучаецца больш 230 замежных юнакоў і дзяўчат з 12 краін свету: больш 100 чалавек з В'етнама, Кубы, Манголіі, Польшчы, Балгарыі, Афганістана, Малі, Ганы, Кеніі і іншых краін на асноўных факультэтах і 129 — на падрыхтоўчым.

Усе замежныя студэнты пераступаюць парог універсітэта, ведаючы толькі некалькі рускіх слоў: «добры дзень», «дзякуй», «добра». А ўжо пасля года вучобы на падрыхтоўчым факультэце большасць замежных студэнтаў асвойвае рускую мову, некаторыя з іх паступаюць у вну рэспублікі і слухаюць лекцыі па выбраных спецыяльнасцях разам з савецкімі студэнтамі.

Замежныя студэнты ў нас спецыялізуюцца па фізіцы, матэматыцы, хіміі, біялогіі, добрасумленна вывучаюць грамадскія навукі. Многія сталі выдатнікамі вучобы: Нгуен Ван Фунг, Та Хынг Кві, Чан Ван Ам, Нгуен Чонг Ньо, Ла Серна Барыс, Чарльз Сонпал Водвард і іншыя.

У мінулым годзе ў нашым універсітэце быў першы выпуск замежных грамадзян. Дыпломы аб вышэйшай адукацыі атрымалі 52 чалавекі, у тым ліку 42—з Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Вельмі высокай адзнакі заслужылі іх дыпломныя работы. Так, напрыклад, 44 абаранілі дымпломныя работы на выдатна, 18 выпускнікоў атрымалі дыпломы выдатніка.

З 1963 года ў аспірантуру ва універсітэт прынята 25 чалавек. За гэты час 10 замежных грамадзян закончылі вучобу і практыку, двое з іх абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Цяпер у аспірантуры і на стажыроўцы навучаецца 15 чалавек з В'етнама, Манголіі, Польшчы, Балгарыі.

Ва універсітэце замежным грамадзянам прадастаўлены ўсе ўмовы, каб атрымаць глыбокія веды і навыкі па выбраных спецыяльнасцях, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, а само жыццё ў Савецкім Саюзе становіцца для іх другім універсітэтам. Гэтаму садзейнічаюць падрыхтоўка да заняткаў разам з савецкімі студэнтамі, шматлікія экскурсіі на заводы, у музеі, школы, палацы піянераў, дзіцячыя сады, вечары інтэрнацыянальнай дружбы, сустрэчы і знаёмства з савецкімі людзьмі. Усё гэта замацоўвае дружбу і выхоўвае пачуццё ўзаемнай павагі паміж моладдзю замежных краін і Савецкага Саюза.

## БЕЛАРУСЬ—МАЯ ДРУГАЯ РАДЗІМА

Многія замежныя студэнты палюбілі Мінск, універсітэт і з вялікай цеплынёй успамінаюць гады вучобы і жыццё ў Беларусі.

«...Пакідаючы Мінск, сваіх сяброў, я астаўляю тут часцінку свайго сэрца», — піша Нгуен Чьеу Ту.

Усе выпускнікі нашага універсітэта ўмела прымяняюць атрыманыя веды ў сябе на Радзіме.

У бягучым навучальным годзе яшчэ адна група замежных грамадзян заканчвае наш універсітэт. Яны вернуцца да сябе на Радзіму спецыялістамі, якія здольны несці веды свайму народу.

Шчырыя пісьмы замежных студэнтаў гавораць аб многім, але перш за ўсё — аб непарушнай дружбе і супрацоўніцтве народаў нашай сацыялістычнай Радзімы і краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі ў імя міру і прагрэсу на зямлі.

**Ц. СТАРЧАНКА.**

## Гасціннасці дзякуй

Закончылася азнаямленча - вытворчая практыка студэнтаў Іенскага універсітэта ў Мінску. Яны праслухалі ў нашым універсітэце лекцыі па рускай мове і літаратуры, азнаёміліся з дзейнасцю камсамольскай арганізацыі, вучобай і жыццём студэнтаў. Сябры з ГДР наведалі музеі і тэатры сталіцы Беларусі, знамянальныя мясціны горада.

На працягу трох тыдняў яны былі акружаны клопатамі сваіх сяброў з беларускага універсітэта. Выкладчыкі, студэнты імкнуліся дапамагчы ім у прахаджэнні практыкі, высвятленні ўсіх цікавячых іх пытанняў. Перад ад'ездам госці сардэчна падзякавалі ўсіх універсітэцкіх таварышаў, якія былі звязаны з дэлегацыяй. Вось вытрымка з пісьма на імя рэктара акадэміка А. Н. Сеўчанкі: «Мы, члены студэнцкай дэлегацыі Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера, у час практыкі моцна пасябравалі з вадзіцелем аўтобуса Міхаілам Міхайлавічам Дудзічам... Ён аказаўся не толькі выдатным шоферам, але і не менш здольным экскурсаводам. Ён дапамог нам яшчэ больш палюбіць беларускі край. Сардэчнае яму дзякуй».

Супрацоўніцтва паміж нашым і Іенскім універсітэтамі плённа развіваецца.



*На здымку: нямецкія студэнты ў гасцях у філолагаў.* *Фота І. АСКІРКІ.*

## СЁННЯ НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ

*Група савецкіх і замежных студэнтаў асноўных факультэтаў 8 мая выязджала на святкаванне Дня Перамогі ў горад Брэст. Студэнты наведалі Брэсцкую крэпасць-герой, пабывалі ў Белавежскай пушчы.*

*● У сувязі з 150-годдзем з дня нараджэння К. Маркса ў памяшканні Беларускага таварыства культурных сувязей з зарубежнымі краінамі для савецкіх і замежных студэнтаў дэманстраваўся фільм «Год як жыццё».*

*● На падрыхтоўчым факультэце адбыўся адкрыты партыйны сход, на якім была абмеркавана індывідуальная работа са студэнтамі. Сход прыняў рашэнні, накіраваныя на паляпшэнне індывідуальнай работы са студэнтамі.*

*● У канцы мая 120 в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта разам з савецкімі сябрамі на чатырох аўтобусах выедуць на экскурсію ў Брэсцкую крэпасць-герой. Там яны сустрэнуцца з удзельнікамі абароны крэпасці, выступяць з канцэртам перад брэстаўчанамі.*

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

# ЯНЫ БЫЛІ

*САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА паміж студэнцкімі калектывамі навучальных устаноў нашай краіны мае сваю гісторыю і добрыя традыцыі. Нарадзіўшыся ў пачатку 30-х гадоў, яно жыве і па сённяшні дзень. З года ў год пашыраюцца сувязі беларускіх студэнтаў не толькі са студэнтамі нашай краіны, але і за яе межамі. Прыемна адзначыць, што студэнты нашага універсітэта першымі ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва, падтрымаўшы пачын кіяўлян. Аб гэтым газета «Беларускі універсітэт» ужо расказвала 15 снежня 1967 года.*

*Дакументы, якія мы тут прыводзім сёння, дапаўняюць гутарку аб тым, як пачыналася сацыялістычнае спаборніцтва, як у яго ўключаліся новыя калектывы, якую ролю адыгралі ў спаборніцтве ленінскія творы, партыйныя, камсамольскія і грамадскія арганізацыі навучальных устаноў. Гэты артыкул — часцінка вялікай працы, якую яшчэ трэба зрабіць.*

## ЛІКВІДАВАЦЬ ДОЎГ СТАГОДДЗЯЎ

*(Тэзісы аб сацыялістычным спаборніцтве ў БДУ)*

У нашых умовах неабходна асноўную ўвагу звярнуць на культурны ўздым краіны, не раскідваючыся паміж дзесяткамі розных спраў, неабходна вылучыць у сацыялістычным спаборніцтве канкрэтную задачу, вырашэнню якой трэба прысвяціць усю ўвагу, усе сілы. Такой задачай павінна стаць ліквідацыя непісьменнасці ў Мінску. «Усе гавораць аб ліквідацыі непісьменнасці. Вы ведаеце, што ў краіне непісьменнай пабудова камуністычнага грамадства немагчыма. Але ці дастаткова таго, каб Савецкая ўлада загадала, ці каб гісторыя дала пэўны лозунг, ці каб кінуць вядомую частку лепшых работнікаў на гэтую справу? Вы ведаеце, што хутка ператварыць Расію з цёмнай непісьменнай краіны ў пісьменную нельга. Камунізм заключаецца ў тым, каб тая моладзь, тыя юнакі і дзяўчаты, якія з'яўляюцца членамі Саюза Моладзі сказалі: гэта наша справа, мы аб'яднаемся і пойдзем у вёску, каб ліквідаваць непісьменнасць, каб наша падрастаючае пакаленне не мела непісьменных... Толькі ў такой працы ператвараецца малады чалавек і дзяўчына ў сапраўднага камуніста. Толькі ў тым выпадку, калі яны гэтай працай здолеюць дасягнуць практычных поспехаў, яны становяцца камуністамі». (У. І. Ленін).

У Мінску 9 тысяч непісьменных. Ва універсітэце 3 тысячы студэнтаў; заклікаўшы на гэтую працу КамВНУ, тэхнікумы, мы можам і павінны паставіць перад сабой канкрэтную задачу — за год ліквідаваць непісьменнасць у Мінску. З гэтай мэтай разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж факультэтамі, аддзяленнямі і курсамі на:

а) лепшую арганізацыю ўліку непісьменных Мінска;

б) большае вылучэнне ліквідаваўшых непісьменнасць;

в) больш акуратнае наведванне гурткоў;

г) большую колькасць выпушчаных з гурткоў.

* * *

...На аснове гэтых тэзісаў распрацоўваліся мерапрыемствы, заключаліся дагаворы, вызначаўся канкрэтны напрамак работы.

## І ПАЧАЛОСЯ...

*(З мерапрыемстваў па правядзенню месячніка «За адукацыю»)*

І. Прымаючы пад увагу пастанову партыі і ўрада аб баявым характары работы па ліквідацыі непісьменнасці, наша арганізацыя «Далоў непісьменнасць» павінна працаваць пад дэвізам «Ні аднаго студэнта БДУ — без удзелу ў барацьбе за адукацыю». Вакол гэтых задач узняць усю грамадскую свядомасць прафсаюза, камсамола і грамадскіх арганізацый БДУ і іншыя навучальныя ўстановы, выклікаць іх на сацыялістычнае спаборніцтва па гэтаму пытанню.

ІІ. Абмеркаваць гэтае пытанне на ўсіх курсавых і факультэцкіх сходах. Узняць шырокі студэнцкі рух на барацьбу з непісьменнасцю, лічачы гэтае пытанне галоўнай грамадскай работай студэнтаў педфака і камсамольскай нагрузкай.

ІІІ Для ажыццяўлення ініцыятывы студэнтаў па арганізацыі агульнагарадскога перапісу непісьменных мабілізаваць да дня перапісу ўсіх студэнтаў БДУ.

ІV. У час месячніка ахапіць таварыствам «Далоў непісьменнасць» усіх студэнтаў педфака і па магчымасці другіх факультэтаў.

V. Для стварэння матэрыяльнай базы правесці падпісныя лісты, вечары, лекцыі і ў кастрычніку агульнастудэнцкі нядзельнік (работы на будаўніцтве), арганізаваць збор кніг і буквароў сярод студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў БДУ для малапісьменных і непісьменных.

На платныя лікпункты (пункты ліквідацыі непісьменнасці) накіраваць студэтнаў, якія не атрымліваюць стыпендыю, але працуюць на грамадскіх пачатках.

* * *

Сацыялістычнае спаборніцтва разгарнулася не толькі паміж навучальнымі ўстановамі нашай рэспублікі, але пераступіла за яе межы.

## ВЫКЛІКАЕМ САРАТАЎ!

*(З дагавора аб спаборніцтве паміж Саратаўскім універсітэтам і БДУ на 1929-1930 навучальны год)*

1. Палепшыць якасць прыёму новых студэнтаў па сацыяльнаму складу.

II. У мэтах пралетарызацыі ВНУ прытрымлівацца наступных працэнтных адносін сацыяльных груп абітурыентаў, якія паступаюць ва універсітэты:

рабочых — 50%;

батракоў — 10%;

беднякоў — 13%;

серадннякоў — 10%;

служачых — 17%;

членаў партыі і камсамольцаў не менш 65%.

У асноўным узяць напрамак на найбольш падрыхтаваную ў акадэмічных адносінах пралетарска-бядняц-

*КАЛЕКТЫЎ НАШАГА АРДЭНАНОСНАГА УНІВЕРСІТЭТА АКТЫЎНА РЫХТУЕЦЦА ДА 50-ГОДДЗЯ РЭСПУБЛІКІ І КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ. ІДУЧЫ ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ, ЁН ВЫСОКА НЯСЕ СЦЯГ ПЕРАДАВОЙ НАВУКІ, ВЫКОНВАЕ ЗАПАВЕТЫ У. І. ЛЕНІНА АБ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫМ ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ, РАЗВІЦЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА. У ГЭТЫМ НУМАРЫ МЫ РАСКАЗВАЕМ АБ ТЫМ, ЯК ПАШЫРАЮЦЦА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СУВЯЗІ УНІВЕРСІТЭТА, ЯКІ ЎКЛАД ЁН УНЁС У СТВАРЭННЕ СЛАЎНЫХ ТРАДЫЦЫЙ САВЕЦКАГА НАРОДА.*

# ВЫКАНАЕМ НАКАЗ БАЦЬКОЎ

Нядаўна мы атрымалі пісьмы з В'етнама — ад бацькоў і сяброў. Пісьмы напісаны на дрэннай і бруднай паперы, таму што пісаліся яны ў бомбасховішчах. Нам пішуць аб тым, што кожны дзень амерыканцы бамбяць мірныя гарады і сёлы, знішчаюць школы, бальніцы, заводы, фабрыкі, жылыя дамы. Так, наш народ нясе вялікія страты, але ён ніколі не стане на калені перад ворагам. Пасля кожнага вылету агрэсары не далічваюцца многіх сваіх самалётаў і лётчыкаў.

На барацьбу за незалежнасць і права самім распараджацца сваім лёсам узняліся старыя і малыя. Разам з мужчынамі гераічна змагаюцца і в'етнамскія жанчыны. Яны працуюць таксама на палях і прадпрыемствах, але і тут ніколі не бываюць без аружжа. Вінтоўка стала спадарожнікам кожнага — працаўніка і навучэнца. Інакш нельга. У любы момант вораг можа парушыць спакой. У такіх выпадках на яго абрушваецца гнеў і помста ўсяго народа. Вось чаму В'етнам непераможны.

На поўдні В'етнама нашы барацьбіты за свабоду дасягнулі вялікіх поспехаў. Усяму свету вядома, якія цяжкія паражэнні панеслі амерыканскія агрэсары. Так будзе да таго часу, пакуль мы не дасягнем поўнай перамогі. Волю в'етнамскага народа выказалі прадстаўнікі ўрада ДРВ на сустрэчах у Парыжы.

Радзіма накіравала нас на вучобу ў Савецкі Саюз. Мы атрымалі наказ глыбока авалодаць ведамі, каб стаць актыўнымі будаўнікамі свабоднага жыцця. У выкананні гэтых наказаў нам вельмі многа дапамагаюць савецкія людзі. Сардэчнае дзякуй за гэта дэкану, усім выкладчыкам і супрацоўнікам падрыхтоўчага факультэта. Мы ніколі не забудзем іх брацкай дапамогі.

**ЧАН ТХІ ТХУ ХЬЕН,**
студэнтка падрыхтоўчага факультэта.



*Каля гэтага помніка воінам на брэсцкай зямлі пабывала нямала замежных сяброў.* *Фота І. АСКІРКІ.*

# ВУЧЫЦЦА Ў ІЛЬІЧА

— Мне часта даводзіцца расказваць аб сваіх сустрэчах з Леніным—да жыцця і дзейнасці вялікага правадыра працоўных цікавасць праяўляюць і дарослыя і дзеці...

Гэтымі словамі пачалася чарговая лекцыя па эканоміцы народнай гаспадаркі выкладчыка Міхаіла Мікалаевіча Клімко на трэцім курсе факультэта журналістыкі. Адкладзены ў бок канспекты. Студэнты ўважліва слухаюць актыўнага ўдзельніка рэвалюцыйных падзей у Маскве, які пачаў сваё служэнне народу яшчэ ў 1905 годзе, калі быў салдатам царскай арміі.

М. М. Клімко ўпершыню ўбачыў Леніна на адным з пасяджэнняў кангрэса Камінтэрна. Выступленне Уладзіміра Ільіча не зразумеў, таму што Ленін выступаў не на рускай мове. А вось Першага мая 1918 года ў час святкавання міжнароднага дня працоўных яму пашчаслівілася стаяць амаль ля самай трыбуны, з якой выступаў Ленін. Прыкладна праз год Міхаіла Мікалаевіча накіравалі на вучобу ў Маскву. І вось тут ён яшчэ неаднаразова слухаў Ільіча. На ўсё жыццё запомніліся ленінскія ўказанні як трэба будаваць новае грамадства, сацыялістычную эканоміку, узмацняць абараназдольнасць Радзімы. Ленін дапамог нам, слухачам, глыбей засвоіць пройдзены матэрыял, дэталёва разабрацца ў самых складаных пытаннях, якія хвалявалі рабочых і сялян, служачых і чырвонаармейцаў.

Пасля заканчэння вучобы М. М. Клімко паехаў працаваць. На кожным участку ён выконваў наказы У. І. Леніна. А яны зводзіліся да таго, каб глыбока вывучаць справу, за якую ўзяўся, раіцца з людзьмі перш чым прымеш рашэнне, рабіць усё для таго, каб ісці ад аднаго поспеху да другога.

У 1923 годзе Міхаіл Мікалаевіч у апошні раз бачыў Леніна ў Калонным зале Дома Саветаў, дзе ён выступаў на нарадзе камандзіраў Чырвонай Арміі. Пасля прамовы ён падышоў да ўдзельнікаў нарады і пацікавіўся іх справамі. Пасыпаліся адказы. Ленін уважліва выслухаў кожнага, а на развітанне дадаў:

— Вучыцца трэба, трэба вучыцца!

Гэтыя словы кожны ўспрыняў не толькі ў свой адрас, бо Ленін звяртаўся з гэтым заклікам да ўсяго народа.

Не, не выпадкова Міхаіл Мікалаевіч заканчвае свой уступ да лекцыі іменна гэтымі словамі, якія ён чуў ад Леніна 45 год назад. Чалавек вялікага жыццёвага вопыту, ён імкнецца перадаць студэнтам набытыя веды ў бібліятэках, навучальных установах і ў працы. Лекцыі М. М. Клімко вылучаюцца багатым фактычным матэрыялам, шырокімі абагульненнямі, доказнасцю вывадаў. Пасля яго лекцыі хочацца яшчэ і яшчэ раз зазірнуць ва ўжо не раз прачытаныя творы Леніна і вось цяпер знаходзіш у іх нешта новае, чаго не заўважыў раней.

Так, вучыцца ў Ільіча гэта значыць глыбей разумець сучаснасць, лепш працаваць. Вось чаму студэнты так удзячны Міхаілу Мікалаевічу за яго парады.

**А. ПАЎЛЯНКОЎ,**
**студэнт журфака.**

# ПЕРШЫМІ

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

кую групу, давёўшы яе да 80% .Прыём павінен быць закончаны і спісы прынятых павінны быць вывешаны не пазней 15 верасня.

Змагацца за 100% наведванне заняткаў студэнтамі, за марксісцкае выкладанне.

Палепшыць пастаноўку выкладання замежных моў, дабіцца сур'ёзных адносін студэнтаў да апошніх.

Палепшыць методыку работы прадметных камісій. Узмацніць сувязь студэнцкіх прадстаўнікоў у прадметных камісіях з шырокай масай студэнцтва і ўзняць іх актыўнасць у паўсядзённай працы.

Палепшыць справаздачы кафедраў аб сваёй дзейнасці перад прадметнымі камісіямі (па семестрах, з шырокім удзелам студэнцтва).

III. Лічачы важнай сувязь пралетарскага студэнцтва з рабочымі і бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства, шырэй разгарнуць шэфства шляхам наступнага дапасавання да прадпрыемстваў і сельсаветаў.

Для правядзення гэтай работы вылучыць 1/6 частку студэнцтва.

У дапамогу гарадскім Саветам у практычным ажыццяўленні наказаў выбаршчыкаў ва ўсіх секцыях вылучыць 30 студэнтаў.

У падшэфных падраздзяленнях Чырвонай Арміі і міліцыі горада арганізаваць дастатковую колькасць гурткоў па ліквідацыі непісьменнасці для 100% ахоплівання малапісьменных і непісьменных чырвонаармейцаў і міліцыянераў.

Праводзіць сумесна культмасавыя вечары.

Знаёміць студэнтаў з жыццём і бытам чырвонаармейцаў і міліцыянераў і наадварот.

Абменьвацца насценгазетамі. Арганізаваць палітшколы чырвонаармейцаў і міліцыянераў.

Вылучыць для гэтай работы не менш 50 студэнтаў.

Арганізаваць курсы для падрыхтоўкі сялянскай моладзі ў ВНУ.

Арганізаваць курсы на падшэфным прадпрыемстве. Арганізаваць групу ў у падшэфным с/савеце для падрыхтоўкі ў ВНУ з батракоў і беднякоў у колькасці 25 чалавек. Для правядзення гэтай работы вылучыць 25 студэнтаў.

## АДКУЛЬ МЫ БРАЛІ НАТХНЕННЕ?

*Гэтае пісьмо з'яўляецца як бы каментарыем да нашай размовы. І на маю думку, яно дапаўняе некаторыя моманты з яе. Тым больш, што з яго аўтарам Паўлам Мікалаевічам Пятрэнка чытачы нашай газеты ўжо знаёмы.*

Перш за ўсё аб спаборніцтве, дагавор аб якім быў падпісаны ў 1929 годзе. Гэта ініцыятыва студэнтаў Кіева адлюстроўвала агульны палітычны рост і свядомасць працоўных нашай краіны, занятых умацаваннем эканамічнага становішча. Натхніў на заключэнне дагавора сацыялістычнага спаборніцтва надрукаваны ў «Праўдзе» артыкул У. І. Леніна «Як арганізаваць спаборніцтва». Артыкул гэты быў надрукаваны ўпершыню ў 1929 годзе, хоць напісан быў у 1917 годзе, у снежні месяцы.

«Сацыялізм, — пісаў У. І. Ленін,—не толькі не згашае спаборніцтва, а, наадварот, стварае магчымасць прымяніць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым памеры, прыцягнуць сапраўды большасць працоўных на арэну такой работы, дзе яны змогуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасці, выявіць таленты, якіх у народзе—не пачатая крыніца і якія капіталізм знішчаў, прыціскаў, душыў тысячамі і мільёнамі».

Гэтая ідэя У. І. Леніна ажыццяўлялася студэнтамі Кіева і Мінска. Яны заключылі дагавор. Не трэба забываць, што толькі што была ліквідавана бела-кітайская правакацыя на Усходне-кітайскай чыгунцы. Успамінаю, што шмат студэнтаў Кіева падалі тады заяву аб залічэнні іх дабраахвотнікамі ў дзеючую армію. Наша група арганізавала дабраахвотны студэнцкі артылерыйскі ўзвод пад маім камандаваннем (к таму часу камандзірам узвода запаса). Але ўсё абыйшлося без нас...

Ва ўсіх аўдыторыях ішлі гарачыя спрэчкі аб пунктах дагавора сацыялістычнага спаборніцтва. Урэшце дагавор быў выпрацаваны, складзены і абмеркаваны агульным сходам. Перш за ўсё дагавор насіў палітычны характар аб выхаванні будучых будаўнікоў сацыялістычнага грамадства, бязмежна адданых ідэям Маркса—Энгельса—Леніна, гатовых на любым месцы да канца змагацца за справу Кастрычніка!

Дагавор уключаў пункты акадэмічнай паспяховасці, барацьбы за якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, барацьбы за засваенне асноў марксізма-ленінізма. Былі абавязацельствы ўзаемадапамогі і дапамогі адстаючым, аб паглыбленні ваенных ведаў. Сюды ўключаліся пункты па пытанню паляпшэння быта, матэрыяльнай дапамогі студэнтам.

Вядома, там былі і колькасныя паказчыкі, але я іх не памятаю.

Падводзіліся вынікі ў Кіеве. Перамаглі энтузіязм студэнтаў Кіева і Мінска. Канчатковыя вынікі падводзіліся ў Маскве, пры інстытуце народнай гаспадаркі імя Г. В. Плеханава. Гэта было ў 1939 г. Мне давялося быць у складзе дэлегацыі кіеўскіх студэнтаў...

У тыя дні мы жылі разам з масквічамі-студэнтамі ў інтэрнаце і вельмі пасябравалі.

Давялося мне нядаўна пабываць у тых аўдыторыях...

Дарэчы,. у Мінску мы былі гасцямі Рамана Касцюкевіча—сакратара камсамольскай арганізацыі БДУ.

З кіеўскіх студэнтаў, маіх аднакашнікаў — інстытуцкіх таварышаў мне памятаюцца актывісты сацыялістычнага спаборніцтва Пётр Еўдакімавіч Руды — зараз доктар навук, працуе ў Кіеве, быў сакратаром камітэта ВЛКСМ, Фёдар Кузміч Чабатароў — член парткома, былы старшыня Кіеўскага гарсавета, зараз персанальны пенсіянер усесаюзнага значэння, Мікалай Віктаравіч Падгорны—член Палітбюро ЦК КПСС.

На маю думку, усе арыгіналы дагавораў загінулі ў перыяд часовай нямецка-фашысцкай акупацыі.

Вядома, калі бярэшся за пяро, то ўсплываюць розныя ўспаміны: у гэты час я быў адказным сакратаром, членам прэзідыума прафкома студэнтаў, член бюро райкома камсамола, парторгам групы і г. д.

Шмат клопатаў было і ў барацьбе за веды, бо існуючы ранейшы метад брыгаднай падрыхтоўкі студэнтаў да залікаў і калектыўнай іх здачы вельмі панізіў узровень вучобы. Цяпер патрабавалася, каб кожны студэнт адказваў за асабістую падрыхтоўку, а не спадзяваўся на «брыгадзіра». Сам ведай — сам здавай, тады і калектыў будзе лепшым.

Шмат студэнтаў працавала на камуністычных суботніках. Памятаю, як дапамагалі будаваць кіеўскі вакзал-прыгажун!

Нявялікая папраўка: я быў студэнтам Кіеўскага інстытута народнай гаспадаркі.

* * *

**Прачытана яшчэ адна старонка з геранчнай гісторыі універсітэта. Цяпер наш універсітэт мае цесныя сувязі з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі не толькі савецкай краіны, але і за яе межамі. Спаборніцтва ўзбагачае яго вялікі вопыт у выхаванні моладзі і разам з тым многае перадаецца сябрам.**

А. ЯРОХІН.

*Аўтар прыносіць шчырую ўдзячнасць дацэнту БДУ Марыі Беніямінаўне Фрыдман і контрадміралу ў адстаўцы Паўлу Мікалаевічу Пятрэнку за вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага матэрыялу.*

# УШАНАВАННЕ ЮБІЛЯРА

Напярэдадні свята Перамогі на сумесным пасяджэнні калектывы кафедр гісторыі КПСС прыродазнаўчых і гуманітарных факультэтаў ушанавалі свайго калегу — дацэнта, Героя Савецкага Саюза Аляксандра Андрэевіча Філімонава ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння. Павіншаваць юбіляра прыйшлі прадстаўнікі Мінскага гаркома КПБ, выканкома гарсавета дэпутатаў працоўных, рэктарата, парткома і мясцкома універсітэта.

Загадчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў дацэнт Т. І. Прытыцкая, адкрыўшы пасяджэнне, павіншавала А. А. Філімонава, расказала аб яго працоўным шляху, адзначыла яго заслугі перад Радзімай, яго ўклад у развіццё гістарычнай навукі і падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў.

Т. І. Прытыцкая паведаміла, што Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР за паспяховую педагагічную і грамадскую дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння ўзнагародзіла дацэнта А. А. Філімонава Ганаровай Граматай. Па даручэнню міністэрства Т. І. Прытыцкая ўручае грамату юбіляру.

— Мне, як удзельніку вайны, вельмі прыемна павіншаваць Аляксандра Андрэевіча з двайным юбілеем у яго жыцці — 50-годдзем з дня нараджэння і з Днём Перамогі, тым больш, што ён з'яўляецца актыўным удзельнікам Айчыннай вайны, — гаворыць загадчык аддзела вну гаркома КПБ тав. Н. С. Лушчакоў.

Н. С. Лушчакоў па даручэнню бюро гаркома партыі уручыў А. А. Філімонаву Ганаровую Грамату Мінскага гарадскога камітэта партыі і гарадскога выканаўчага камітэта дэпутатаў працоўных, якой ён узнагароджан за шматгадовую і плённую працу па навучанню і выхаванню моладзі, за актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці горада і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння.

Цёпла павіншавала юбіляра і ўручыла яму Ганаровую Грамату рэктарата, парткома і мясцкома сакратар парткома Т. Я. Дударава.

Ва ўрачыстай прамове загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў доктар філасофскіх навук, прафесар У. М. Сікорскі расказаў аб многіх гадах сумеснай працы з А. А. Філімонавым.

— Дваццаць год таму назад, — гаворыць У. М. Сікорскі, — я разам з Аляксандрам Андрэевічам здаваў дзяржэкзамены, разам паступалі ў аспірантуру і амаль разам абаранялі кандыдацкія дысертацыі, разам працавалі і, такім чынам, разам жылі гэтыя 20 год. Аляксандр Андрэевіч зрабіў многае, і думаю, што яшчэ многае зробіць.

Я хачу ад свайго імя і ўсіх членаў кафедры гісторыі КПСС гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў далучыцца да тых добрых і цёплых пажаданняў, якія былі выказаны, пажадаць Аляксандру Андрэевічу многа яшчэ зрабіць на карысць нашай навукі і, галоўнае, пажадаць моцнага здароўя і паспяховай абароны доктарскай дысертацыі.

Ад імя абедзвюх кафедр гісторыі КПСС прафесар Сікорскі уручыў А. А. Філімонаву адрас і памятны падарунак.

Кожная прывітальная прамова заканчвалася сардэчнымі словамі пажаданняў юбіляру выдатнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, поспехаў у выхаванні студэнцкай моладзі, развіцці гістарычнай навукі і вялікага шчасця.

А. АЛЕЙНІКАВА.

## *Паэтычная рубрыка*



*Анатоль КАЗЛОВІЧ— студэнт трэцяга курса факультэта журналістыкі. Яшчэ вучнем ён паспрабаваў сілу пяра — напісаў вершы пра маляўнічую прыроду. Не зусім гладкімі атрымоўваліся першапачатковыя паэтычныя спробы. Але клапатлівыя пошукі ў творчасці не пакідалі Анатоля. Пад час вучобы ў дзесятым класе ён паспяхова выступае на старонках раённай газеты. Непрыкметна вырас наш сябра па пяру. Цяпер ён член літаратурнага аб'яднання «Узлёт», яго вершы друкуюцца на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў.*

*Сёння мы прапануем нашым чытачам адзін з вершаў Анатоля Казловіча.*

### ДАРОЖНАЕ

Беленькія слупікі,
Нітачка шашы,
Ветрана пад крыламі
Маладой душы.

Дзе прыстаць—не ведаем,
Ах, навошта знаць!
Беленькія слупікі
Мільга-мільгацяць...

Ад бяды вясновае
Неспакойных рэк
Да вады асенняе —
Цэлы, цэлы век!

Крылы нам не звязаны,
Далі берагоў...
Праляцім па свеце мы
Тысячы кругоў...

І хай потым кружыцца
Галава ў цішы...
Беленькія слупікі.
Нітачка шашы!..

*ГЕНАДЗЬ ПАШКОЎ*

### ЯБЛЫКІ

Сушым яблыкі, засушваем,
Беражом да белае зімы,
Каб прыйшлі ў завеі
калючыя
Лета яблыкавыя сны.
А часам сушым жыццё
Скараспелым ямбам.
Хлопцы,
Прашу,
не сушыце
Маладосці,
Яна не яблык.

*Спорт*

# ПАМНОЖЫМ ЛЕПШЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Цяжка знайсці калектыў фізічнай культуры, у якім не было б валейбольнай секцыі. Папулярнасць валейбола заваявалі высокая эмацыянальнасць гульні, нескладанае прыстасаванне, параўнаўча простыя правілы. Аднак памылкова рабіць вывад, што валейбол — простая і ўсімі дасягальная гульня, якая не патрабуе фізічных намаганняў і высокіх валявых якасцей. Адна справа проста навучыцца іграць, другая — дасягнуць высокіх вынікаў. Авалоданне тэхнікай і тактыкай у дасканаласці — працэс складаны і працаёмкі, ён патрабуе вялікіх сумесных намаганняў трэнера і спартсменаў.

Нашы універсітэцкія каманды, мужчынская і жаночая, за апошнія два гады выйшлі ў лік вядучых у Мінску і рэспубліцы.

У лютым і ў красавіку гэтага года прайшлі два туры першынства БССР па валейболу, у якім удзельнічаюць зборныя каманды вобласцей і дзве каманды горада Мінска. Пакуль што лідыруюць нашы хлопцы і дзяўчаты. А ігры былі вельмі цяжкімі. На першынстве вну рэспублікі нашы дзяўчаты апярэдзілі мацнейшых сапернікаў з інстытута фізкультуры і палітэхнічнага. Рабяты занялі ганаровае трэцяе месца, прапусціўшы наперад толькі каманду майстроў і студэнтаў інстытута фізкультуры.

І ўсё ж спорт спортам, а на першым плане — вучоба. І ён не павінны перашкаджаць ні трэніроўкі, ні спаборніцтвы. А каб дасягаць поспехаў і ў вучобе, і ў спорце, неабходны высокая самадысцыпліна, арганізаванасць. Прыемна, што многія нашы валейбалісты валодаюць гэтымі якасцямі.

Будучы юрыст Віктар Рабаў у зімовую сесію атрымліваў толькі выдатныя адзнакі. Заняткі валейболам не перашкаджаюць студэнтцы геолага-геаграфічнага факультэта Нэле Новікавай праводзіць вялікую грамадскую работу: яна член бюро камітэта камсамола факультэта. Выдатна заканчвае вучобу ва універсітэце выпускніца хімфака Ядзя Цыбульская—ігрок асноўнага складу зборнай каманды. За тры гады вучобы ва універсітэце ні разу не выклікала занепакоенасці паспяховасць Люды Антонавай і Валі Трахіменка з матфака.

Першая сесія — самая цяжкая для студэнта, але першакурсніца Тамара Біч парадавала добрымі адзнакамі. Усе гэтыя дзяўчаты выступаюць на гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах пад флагам зборнай каманды універсітэта. Знешне яны нічым не выдзяляюцца сярод сваіх сяброўак-студэнтак. У кожнай з іх свой характар, не заўсёды пакладзісты: яны могуць з вялікай перакананасцю адстайваць сваю праваіту, часамі даволі спрэчную. Яны ўсе вельмі розныя, але ўсе аднолькавы ў сваёй адданасці валейболу, у павазе да спартыўных традыцый.

Закончыўшы універсітэт, выбываюць ігракі з каманды, але іх месцы займаюць навічкі, студэнты новага пакалення.

Наша задача — захаваць і памножыць добрыя традыцыі універсітэцкіх валейбалістаў, зрабіць гэты від спорта вядучым. І мы ўпэўнены, што з дапамогай грамадскасці, аматараў гэтай цудоўнай ігры валейбалісты універсітэта яшчэ не раз парадуюць добрымі вынікамі.

М. КУЧЫНСКІ,
выкладчык кафедры фізвыхавання.

# У ПЕРАМОЖЦАХ ФІЗІКІ

Закончылася першынство універсітэта па плаванню. На працягу 15 год фізічны факультэт займае першае месца. У гэтым годзе фізікі страцілі двух майстроў спорту, якія закончылі універсітэт. Але нягледзячы на гэта, дружнымі намаганнямі факультэт усё ж заваяваў першае месца, выйграўшы ўсяго 573 ачкі ў плаўцоў біялагічнага факультэта. Далей месцы падзяліліся наступным чынам: III месца занялі хімікі, IV—юрысты, V — матэматыкі, VI — гісторыкі.

Неабходна адзначыць зборны калектыў плаўцоў юрыдычнага факультэта, які пасля пяцігадовага перапынку выставіў сваю каманду на першынства універсітэта і заняў пачэснае чацвёртае месца.

Зараз зборны калектыў плаўцоў універсітэта рыхтуецца да XI летняй Усебеларускай спартакіяды студэнтаў, прысвечанай 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, якая будзе праведзена 24—26 мая. Асноўныя нашы канкурэнты—студэнты Інстытута фізічнай культуры, калектыў якіх у гэтым годзе папоўніўся двума майстрамі спорту, — будуць для нас дастойнымі праціўнікамі. Пажадаем плаўцам шчаслівых стартаў.

В. СОБАЛЕВА,
ст. выкладчык.



*Амаль не бывае цішыні ва універсітэцкіх спартыўных залах. Тут робяць першыя крокі навічкі і удасканальваюць майстэрства ветэраны, тут мацнеюць мускулы, загартоўваецца воля, нараджаюцца новыя рэкорды.*

*НА ЗДЫМКУ: чарговая трэніроўка баскетбалістаў.*



# ХІМІКІ ПАБІЛІ «РЭКОРД»

Фінал вясенняга лёгкаатлетычнага кроса, які адбыўся напярэдадні Першамая ў парку «Перамогі», ускрыў недахопы ў арганізацыі студэнтаў на факультэтах для ўдзелу ў кросе.

Гістарычны факультэт, які заўсёды займаў першае месца, аказаўся на пятым, фізічны, які ніколі не выходзіў з першай тройкі, заняў перадапошняе месца. Хімічны факультэт пабіў «рэкорд» масавасці, выставіў тры чалавекі, а гэта ж быў адзін з лепшых факультэтаў у пастаноўцы спартыўна-масавай работы. Ды і не толькі ў кросе факультэт займаў прызавыя месцы. Ён і ў круглагадовай спартакіядзе заўсёды быў у ліку прызёраў. Адказны за спартыўную работу выкладчык В. Г. Зямцоў да гэтага часу не наладзіў сувязь са спартыўнай грамадскасцю факультэта, з адказнымі за спорт ад партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый.

Неабходна ўлічыць гэтыя памылкі і пастарацца ў астатніх спаборніцтвах круглагадовай спартакіяды адрадзіць былую спартыўную славу.

М. ЖАЎНЕРКА,
ст. выкладчык кафедры фізвыхавання.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі кроса на дыстанцыі.

# МЫ І НАТАЛЛІ

Спачатку мы гаварылі аб яго дыпломнай, аспрэчвалі тыя ці іншыя сцвярджэнні, потым аб размеркаванні, якое, як заўсёды, застае студэнта знянацку. Што ж выбраць? Куды паехаць? Затым пераключыліся на апошнія падзеі ў свеце, і неяк неспадзявана для саміх сябе гаворка прыняла філасофскі ўхіл.

— Я не згодзен з табой. Калі нават дапусціць такую ўмоўнасць, што маса чалавецтва стане роўнай масе зямлі...

— Цішэй, філосафы, — супакойвае нас Ліда і вачыма паказвае на маленькую каляску, што стаіць каля самага ложка.

... Вось я і кажу, — сабраўся працягваць сваю думку Толя, але капрызны настойлівы плач прымусіў яго змоўкнуць.

— Дагаварыліся, — засмяялася Ліда і адклала падручнік па французскай мове ўбок.

— У чым справа? — запытальна гляджу на Толю.

— У тым, мой бестурботны сябра, што мы павінны адпачыць. Падыхаць свежым паветрам. І, наогул, радавацца жыццю. Так хоча Наталлі.

І вось мы ўтрох беражліва выкачваем беленькую каляску на вуліцу і нетаропка ідзем насустрач святочна прыбраным людзям. І я ўважаю, як горда і ўрачыста крочыць мой сябра, як клапатліва раз-пораз схіляецца над каляскай Ліда, як сцішаюць крокі незнаёмыя пешаходы і раяць:

— Адкрыйце больш ёй тварык...

— Глядзіце, каб шкло было крыху нахілена.

І Толя з непазнавальнай паспешнасцю і дзелавітасцю імкнецца выправіць заўважаныя непаладкі.

З адкрытых вокнаў інтэрната выглядаюць прыхвачаныя ружовымі промнямі веснавога сонца дзявочыя твары. І такая навокал прыгажосць, такая цішыня, такое ззянне, што я ўпершыню пасапраўднаму адчуваю вясну.

А Наталлі ляжыць у сваім маленькім караблі-ку, звязаная па руках і нагах, і нікому не скардзіцца, нічога не гаворыць, а толькі пільна сочыць сваімі яснымі вочкамі, афарбаванымі ў колер густога сіняга неба, за зіхатлівым зайчыкам, які адбягае то на маміных, то на татавых вуснах, і задаволена, напэўна, адзначае, што ўсё ідзе правільна і належным чынам.

В. ПОЛЯК.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР М. ІОСЬКА.

Зак. 762. Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 02204